УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

**ПАЛОСІН ЯЎГЕН МАКСІМАВІЧ**

**АКЦЁР, НАРОДНЫ АРТЫСТ СССР**

**24 СНЕЖНЯ 1911 Г. (6 СТУДЗЕНЯ 1912 Г.) – 25 МАЯ 1981 Г.**

**ВЕСНІНА (ЯДЗІТКІНА) ЛІЗАВЕТА САЛАМОНАЎНА**

**АКТРЫСА, ЗАСЛУЖАНАЯ АРТЫСТКА БССР, ЖОНКА Я.М. ПАЛОСІНА**

**15 КАСТРЫЧНІКА 1917 г. – (?)**

**ФОНД № 352**

**ВОПІС № 1**

**1941 г. – 1986 г.**

**МІНСК 2019**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 352**


| №№ | Назва раздзелаў | № справ | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ Я.М. ПАЛОСІНА | 1-36 | 1-5 |
| 1.1. | ДАКУМЕНТЫ АРТЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Я.М. ПАЛОСІНА | 1-10 | 1-2 |
| 1.2. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Я.М. ПАЛОСІНА | 11-28 | 2-4 |
| 1.3. | ДАКУМЕНТЫ ПРА Я.М. ПАЛОСІНА | 29-31 | 4-5 |
| 1.4. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 32-36 | 5 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ Л.С. ВЕСНІНАЙ | 37-39 | 5-6 |

## Прадмова

**Палосін Яўген Максімавіч** нарадзіўся 24 снежня 1911 г. (6 студзеня 1912 г.) у в. Урыўкі Ялецкага раёну Ліпецкай вобласці ў сям'і настаўніка. Вучыўся: у Тульскай школе (1921-1926), у школе фабрычна-завадскога навучання пры Тульскім зброевым заводзе (1926-1929). З 1929 г. да 1931 г. працаваў стругальшчыкам на Тульскім зброевым заводзе. Дэбют адбыўся ў завадскім гуртку "Сіняя блуза". З 1931 г. да 1934 г. працаваў у Тульскім тэатры рабочай моладзі і Тульскім тэатры юнага гледача. У 1934-1935 гг. вучыўся ў тэатральным тэхнікуме г. Масквы. З 1935 г. да 1939 г. вучыўся ў Дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва імя А. Луначарскага (курс Л.М. Леанідава). З 1939 г. да 1941 г. працаваў у Гомельскім абласным рускім драмтэатры. Вядомыя акцёрскія работы, выкананыя ў Гомельскім абласным рускім драмтэатры: Ляпкін-Цяпкін ("Рэвізор" М. Гогаля) (1939), Нічыпар ("Хто смяецца апошнім" К. Крапівы) (1940), Дармідонт ("Позняе каханне" А.М. Астроўскага), Бен Акіба ("Урыэль Акоста" К. Гуцкова). З 1941 г. да 1945 г. працаваў у складзе 1-й Беларускай франтавой брыгады 3-га Беларускага фронту, якую потым і ўзначальваў, даўшы за гэтыя гады больш 2000 канцэртаў. З 1945 г. да 1949 г. працаваў у Магілеўскім абласным рускім драмтэатры: акцёрам (1945-1949), дырэктарам (1945-1948). Вядомыя акцёрскія работы, выкананыя ў Магілёскім абласным рускім драмтэатры: Кропля ("Канстанцін Заслонаў" А. Маўзона, 1947), Бальзамінаў ("Женитьба Бальзаминава" А.М. Астроўскага, 1947). У 1949 г. працаваў у Брэсцкім абласным рускім драмтэатры (1949). З 1949 г. да 1976 г. працаваў у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага (з 1973 г. – на пенсіі). Вядомыя акцёрскім работы, выкананыя ў Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага: Вафля ("Дядя Ваня" па п'есе А.П. Чэхава, 1949), Корж ("Песня наших сердец" ("Што посеешь, то и пожнешь") В. Палескага, 1950), Кукушкін ("Брестская крепость" К.Л. Губарэвіча, 1954), Блахін ("Порт-Артур" паводле І. Папова, А. Сцяпанава, 1954), Пярчыхін ("Мещане" М. Горкага, 1956), Сямён Кныш ("Главная ставка" К.Л. Губарэвіча, 1957), Акім ("Власть тьмы" Л.М. Талстога, 1960), Рабінзон ("Бесприданница" А.М. Астроўскага, 1962), Дзед Шчукар ("Поднятая целина" паводле М. Шолахава, 1963), Салаў ("В день свадьбы" В. Розава, 1964), і інш. У [1977 г.] пераехаў у Ленінград да дачкі. Вядомыя ролі ў кіно: Мацей ("Нестерка", рэж. А.Г. Зархі, 1955), Стараста ("Девочка ищет отца", рэж. Л.Ул. Голуб, 1959), Ягор Якімчык ("Любовью нужно дорожить", рэж. С.І. Сплашноў, 1959), Яўген Максімавіч ("Саша-Сашенька", рэж. В.П. Чацверыкоў, 1966), Данііл Жулега

(“Анютина дорога”, рэж. Л.Ул. Голуб, 1967), сыграныя на кінастудыі “Буларусьфільм” і інш.

Заслужаны артыст БССР (1949), народны артыст БССР (1956), народны артыст СССР (1969). Узнагароджаны: ордэнамі “Красной звезды” (1944), “Знак Почеты” (1949, 1955), медалямі “За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг.” (1946), “За доблестный труд в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг.” (1946).

Памёр Я.М. Палосін 25 мая 1981 г. Пахаваны на Нова-Волкаўскіх могілках Ленінграда.

**Весніна Лізавета Саламонаўна (сапр. Ядзіткіна-Весніна)** нарадзілася 15 кастрычніка 1917 г. у Абхазіі (г. Сухумі). Сцэнічную дзейнасць пачала ў 1933 г. на сцэне Тэатра юнага гледача г. Сухумі. З 1936 г. да 1939 г. вучылася ў Ленінградскім фінансава-эканамічным інстытуце і адначасова займалась у тэатральнай студыі (пад кіраўніцтвам Б.В. Зона). Працавала у абласных драматычных тэатрах Беларусі: Гомельскім (1939-1941), франтавой брыгадзе 3-га Беларускага фронту (1941-1944), Магілёўскім (1945-1948), Брэсцкім (1948-1949). З 1949 г. да 1977 г. працавала ў Дзяржаўным рускім драматычным тэатры БССР імя М. Горкага. Вядомыя акцёрскія работы, выкананыя ў Дзяржаўным рускім драматычным тэатры БССР імя М. Горкага: Паліна (“Враги” М. Горькага, 1952), Паэма (“Не называя фамилий” В.Б. Мінко, 1953), Мар’я (“Главная ставка” К.Л. Губарэвіча, 1957), Ніла Сніжко (“Барабанщица” А. Салынскага, 1959), Лушка (“Поднятая целина” паводле М. Шолахава, 1963), Каця (“Варвары”), Калугіна (“Сослуживцы” Э.В. Брагінскага, Э.А. Разанава, 1972) і інш.

Заслужаная артыстка БССР (1961).

Узнагароджана: ордэнам “Знак Пашаны”, медалямі “За перамогу над Германіей” (1946), “За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне” (1946).

Дакументы сямейнага архіва Я.М. Палосіна і Л.С. Весніной паступілі ў БДАМЛМ ад Лізаветы Саламонаўны Весніной у 1986 г. У выніку навуковага апісання быў створаны вопіс № 1, сфарміравана 39 спраў (98 дак.) за 1941 – 1986 гг.

Вопіс складаецца з 2-х невялікіх раздзелаў.

Прадмову склала
вяд. архівіст Н.П. Прынько
2019

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

______________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|

## 1. ДАКУМЕНТЫ Я.М. ПАЛОСІНА

### 1.1. ДАКУМЕНТЫ АРТЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Я.М. ПАЛОСІНА

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Роля Дзеда Шчукара з спектакля "Поднятая целина" М.А. Шолахава (рэж. М.Л. Співак), сыграная Я.М. Палосіным у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага. Машынапіс з паметамі Я.М. Палосіна | 1963 | 13 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 2 | Фатаграфія сцэны з спектакля "Женитьба Бальзаминова" па п'есе А.М. Астроўскага, пастаўленага рэж. [М.Л. Нікіціным] у Магілёўскім рускім абласным драмтэатры, з удзелам Я.М. Палосіна (у ролі Бальзамінава), Л.С. Весніной (у ролі [Раісы Пяжэнавай]) | 1947 | 1 | 1 | |
| 3 | Фатаграфіі Я.М. Палосіна ў ролях: Грышы ("Варвары" М. Горкага, рэж. В.Ф. Фёдараў), Пятра Непуцёвага ("На бойком месте" А.М. Астроўскага, рэж. С.Ф. Уладычанскі), Каржа ("Песня наших сердец" В. Палескага, рэж. Д.А. Арлоў), сыграных у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР | 1949-1952 | 3 | 3 | |
| 4 | Фатаграфіі Я.М. Палосіна ў ролі Пярчыхіна ("Мещане" М. Горкага, рэж. В.Ф. Фёдараў), сыгранай у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага, і сцэны з гэтага спектакля з удзелам Я.М. Палосіна, Л.С. Весніной (у ролі Полі) | 1956 | 2 | 2 | |
| 5 | Фатаграфія сцэны з спектакля "Право на счастье" І.Л. Дорскага, пастаўленага рэж. В.Ф. Фёдаравым у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага, з удзелам Я.М. Палосіна (у ролі Пацехіна), Л.С. Весніной (у ролі Ніны Леанідаўны) | 1956 | 1 | 1 | |
| 6 | Фатаграфіі Я.М. Палосіна ў ролях: Важака ("Оптимистическая трагедия" У.В. Вішнеўскга, рэж. М.Л. Співак), Дзеда Шчукара ("Поднятая целина" паводле М.А. Шолахава, рэж. М.Л. Співак), сыграных у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага | 1957, 1963 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 7 | Фатаграфія сцэны з спектакля "Бесприданница" А.М. Астроўскага, пастаўленага рэж. В.П. Рэдліх у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага, з удзелам Я.М. Палосіна (у ролі Рабінзона) і неўстаноўленага акцёра | 1962 | 1 | 1 | |
| 8 | Фатаграфія сцэны з спектакля "Свадьба на всю Европу" А.М. Арканава, Р.І. Горына, пастаўленага рэж. Ю.А. Арынянскім у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага, з удзелам Я.М. Палосіна (у ролі Васіля Журанкова), Э.М. Аўчыннікавай (у ролі Рымы Куркінай), М.М. Ключнікавай (у ролі Марыны Журанковай) | 1966 | 1 | 1 | |
| 9 | Фатаграфія Я.М. Палосіна ў ролі Печанегава ("Враги" М. Горкага, рэж. А.А. Даброцін), сыгранай у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага, і сцэны з гэтага спектакля з удзелам Я.М. Палосіна і неўстаноўленага акцёра | 1970 | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 10 | Фатаграфія кадра з мастацкага фільма рэж. Л.У. Голуба "Анютина дорога" з удзелам Я.М. Палосіна (у ролі Жулегі), С.У. Карастэлінай (у ролі Анюты). "Беларусьфільм" | 1967 | 1 | 1 | |
| | **1.2. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ Я.М. ПАЛОСІНА** | | | | |
| 11 | Даведка Камітэта па справах мастацтваў пры Савеце Народных Камісараў СССР на імя Я.М. Палосіна аб накіраванні для абслугоўвання ваенных часцей | 1941 | 1 | 1 | |
| 12 | Характарыстыка на Я.М. Палосіна дырэктара Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага О. Гатмана.<br>Машынапіс | 1960 | 1 | 1 | |
| 13 | Загад міністра абароны СССР А. Грэчкі з аб'яўленнем падзякі і аб узнагароджанні Я.М. Палосіна медалём "50 лет Вооруженных Сил" і граматай, выпіска з загада старшыні Камітэта па радыёвяшчанні і тэлебачэнні пры Савеце Міністраў БССР з аб'яўленнем падзякі Я.М. Палосіну за ўдзел у падрыхтоўцы да 40-годдзя ЛКСМБ | 1960, 1968 | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 14 | Пісьмы рэдакцыі газеты "Во славу Родины", дырэктара школы № 30 г. Мінска, праўлення Дома | 1951-1969 | 5 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | культуры Авіяработнікаў, Мінскага акруговага Дома афіцэраў Я.М. Палосіну, Л.С. Весніной і інш. з падзякамі за ўдзел у творчых вечарах, канцэртах і з віншаваннямі.<br>Да пісьма рэдакцыі газеты "Во славу Родины" прыкладзена нататка "Народный артист - в гостях у воинов". Выразка з газеты | | | | |
| 15 | Пісьмо начальніка палітаддзела гарнізона часцей пагранвойск КДБ пры СМ СССР у г. Мінску дырэктару Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага аб камандзіраванні ў г. Брэст Я.М. Палосіна і Л.С. Весніной | 1966 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 16 | Рэпертуарныя лісткі творчых сустрэч і канцэртаў з удзелам Я.М. Палосіна і Л.С. Весніной за 1953 г., [1970-я гг.].<br>Машынапіс з дазволам Галоўліта БССР, машынапіс | | 5 | 4 | |
| 17 | Пасведчанні Упраўлення пагранічных войск КДБ СССР, МУС СССР да ўзнагароджанняў Я.М. Палосіна нагруднымі знакамі "Выдатны пагранічнік", "Выдатнік міліцыі" | 1963, 1975 | 4 | 2 | |
| 18 | Дыплом Прэзідыума праўлення БТА Я.М. Палосіну за выкананне ролі Дзеда Шчукара ў спектаклі "Поднятая целина" М.А. Шолахава , пастаўленага рэж. М.Л. Співаком у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага | 1965 | 2 | 1 | |
| 19 | Мандат дэлегата VI Мінскай абласной канферэнцыі КП(б) Беларусі, пасведчанне дэпутата Мінскага гарадскога савета дэпутатаў працоўных VII склікання ад выбарчай акругі № 436 на імя Я.М. Палосіна | 1959, [1960-я гг.] | 4 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 20 | Запрашэнні ЦК КПБ і Вярхоўнага Савета БССР на ўрачыстае паседжанне, Маладзечанскай цэнтральнай бібліятэкі імя Н.К. Крупскай на навукова-практычную канферэнцыю "Сын тихого Дона", прысвечаную 70-годдзю з дня нараджэння М.А. Шолахава на імя Я.М. Палосіна | 1970, 1975 | 3 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 21 | Праграмы спектакляў Дзяржаўнага рускага | 1949-1957 | 6 | 3 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | драмтэатра БССР імя М. Горкага: "Дядя Ваня", "Когда цветёт акация", "Песня наших сердец", з удзелам Я.М. Палосіна.<br>З аўтографамі-віншаваннямі Д.А. Арлова ад 11.12.1949 г., С.Ф. Уладычанскага ад снежня 1950 г., В.Ф. Фёдарава ад 14.09.1957 г. Я.М. Палосіну | | | | |
| 22 | Праграмы канцэртаў, прысвечаных 85-годдзю з дня нараджэння і 26-й гадавіне з дня смерці У.І. Леніна, 50-годдзю міжнароднага жаночага дня, дню Перамогі з удзелам Я.М. Палосіна | 1950-1960 | 8 | 4 | |
| 23 | Праграмы канцэртаў для дэлегатаў XXII з'езду КП Беларусі, удзельнікаў нарады старшынь калгасаў-трыццацітысячнікаў БССР з удзелам Я.М. Палосіна | 1955, 1956 | 6 | 2 | |
| 24 | Афішы творчых вечароў Я.М. Палосіна | 1961, [1970-я гг.] | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 25 | Віншавальныя адрасы калектываў БДУ імя У.І. Леніна, Магілёўскага абласнога драмтэатра Я.М. Палосіну ў сувязі з 50-ці і 60-ці годдзямі з дня нараджэння | 1961, 1971 | 3 | 2 | |
| 26 | Віншавальныя пісьмо і тэлеграмы выдавецтва часопіса "Театр", ЦК ЛКСМБ, І.М. Раеўскага, В.Ф. Фёдарава Я.М. Палосіну ў сувязі з 50-ці і 60-ці годдзямі з дня нараджэння | 1961, 1971 | 4 | 4 | |
| 27 | Запрашэнні Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага, Прэзідыума БТА, Дома мастацтваў на вечары, прысвечаныя 50-ці і 60-ці годдзям з дня нараджэння Я.М. Палосіна<br>На адным з запрашэнняў змешчаны фатаграфіі Я.М. Палосіна ў ролях і сцэнах з спектакляў | 1961, 1971, 1972 | 7 | 3 | |
| 28 | Артыкулы У.М. Багалюбскага, І. Берцука, Ф. Гулыгі, Ю. Сохара, прысвечаныя 60-ці і 75-ці годдзям з дня нараджэння Я.М. Палосіна.<br>Выразкі з газет | 1971-1986 | 4 | 4 | |
| | **1.3. ДАКУМЕНТЫ ПРА Я.М. ПАЛОСІНА** | | | | |
| 29 | Сцэнарый тэлеперадачы "Народный артист Советского Союза Е.М. Полосин" для Гомельскага тэлебачання.<br>Машынапіс з праўкамі | 1970 | 7 | 1 | |
| 30 | Рэцэнзіі і нататка на спектаклі "Брестская крепость", "Поднятая целина", пастаўленыя ў | 1956-1968 | 6 | 6 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага, з упамінаннем Я.М. Палосіна | | | | |
| 31 | Артыкулы пра ўрачысты вечар, прысвечаны 46-годдзю Савецкіх Узброеных Сіл з упамінаннем Я.М. Палосіна, нататка пра яго, падзяка Я.М. Палосіна гледачам.<br>Выразкі з газет | 1960-[1960-я гг.] | 4 | 3 | |
| | **1.4. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 32 | Фотапартрэты Я.М. Палосіна | [сяр. 1960-х -1970-я гг.] | 5 | 5 | |
| | * * * | | | | |
| 33 | Фатаграфіі Я.М. Палосіна з Л.С. Весніной (жонкай), Ю.Я. Палосінай (дачкой), неўстаноўленай асобай.<br>З дароўным надпісам неўстаноўленай асобы Я.М. Палосіну | 1961-1968 | 3 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 34 | Фатаграфіі Я.М. Палосіна разам з артыстамі І.У. Ільінскім, У.В. Санаевым | [пач. 1960-х - 1970-я гг.] | 2 | 2 | |
| 35 | Фатаграфіі Я. М. Палосіна, індывідуальныя і разам з Л.С. Весніной, вядучым Гомельскай тэлеперадачы "Народный артист Советского Союза Е.М. Полосин" у час творчых сустрэч і здымак тэлеперадачы.<br>З падзякамі і дароўнымі надпісамі Л.О. Пятроўскага ад 02.04.1963 г., неўстаноўленай асобы ад 21.05.1970 г. Я.М. Палосіну | 1963-[пач. 1970-х гг.] | 4 | 4 | |
| 36 | Фатаграфіі Я.М. Палосіна з М.І. Аляксеевым, З.І. Браварскай і інш. у час мерапрыемстваў | [кан. 1960-х - пач. 1970-х гг.] | 3 | 3 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ Л.С. ВЕСНІНАЙ** | | | | |
| 37 | Фатаграфіі Л.С. Весніной у ролях: Каці ("Варвары" М. Горкага, рэж. В.Ф. Фёдараў), Паэмы ("Не называя фамилий" В.Б. Мінко, рэж. І.П. Лакштанаў), сыграных у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР | 1953 | 2 | 2 | |
| 38 | Фатаграфіі Л.С. Весніной у ролі Нілы Сніжко ("Барабанщица" А. Салынскага, рэж. М.Л. Співак), сыгранай у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага, і сцэны з гэтага спектакля з удзелам Л.С. Весніной, М.І. Кузьменко (у ролі Марыі Ігнацьеўны), І.П. Лакштанава (у ролі Мікі Ставінскага), Г.К. Някрасава (у ролі Фёдара), М.Б. | 1959 | 8 | 8 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Сокала (у ролі Кругліка) | | | | |
| | * * * | | | | |
| 39 | "Кніжка нагруднага значка "Выдатнік культурнага шэфства над Узброеннымі Сіламі СССР" на імя Л.С. Весніной | 1958 | 4 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 39 (трыццаць дзевяць)
спраў з № 1 па № 39 , 98 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

______________________

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.